ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ**

ГОМЕЛЬСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ,
КУЛЬТУРЫ И ПО ДЕЛАМ МОЛОДЁЖИ**

# ЗАГАД

# ПРИКАЗ

15.02.2021 № 22

г. Гомель

г. Гомель

Аб правядзенні IX абласнога
конкурсу аркестраў, ансамбляў
струнных народных інструментаў
з найменнем "народны (узорны) аматарскі
калектыў" "Мелодыі роднага краю"
імя Г.І.Жыхарава

З мэтай увекавечвання памяці славутага земляка, вядомага музыканта і педагога Г.І.Жыхарава, развіцця і папулярызацыі ансамблевага і аркестравага жанраў, павышэння выканаўчага майстэрства самадзейных музыкантаў, узбагачэння рэпертуару лепшымі ўзорамі беларускага і сусветнага мастацтваў
ЗАГАДВАЮ:

1. Правесці IX абласны конкурс аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў "Мелодыі роднага краю" імя Г.І.Жыхарава (далей – абласны конкурс) дыстанцыйна ў лістападзе 2021 года.

2. Зацвердзіць палажэнне, умовы і склад арганізацыйнага камітэта абласнога конкурсу (дадаткі 1, 2, 3).

3. Арганізацыю і правядзенне абласнога конкурсу ўскласці на ўстанову "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" (Сафрановіч Н.Д.).

4. Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу ажыццявіць за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі" на 2021-2025 гг. і ўступных ўзносаў.

5. Начальнікам аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама аказаць садзейнічанне ў арганізацыйным забяспячэнні удзелу калектываў у абласным конкурсе.

7. Кантроль за выкананнем дадзенага загада ўскласці на першага намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы,

0007677

Зак. 1400-2000

культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама Заўгародню І.С.

Начальнік галоўнага ўпраўлення Д.У.Езерскі

Волкава 33 46 75

Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 2021 г. №

**Палажэнне**
аб дыстанцыйным правядзенні IX абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" "Мелодыі роднага краю" імя Г.І.Жыхарава

**Мэты абласнога конкурсу.**

Абласны конкурс аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў "Мелодыі роднага краю" імя Г.І.Жыхарава (далей – абласны конкурс) заклікаиы садзейнічаць:

- павышэнню мастацкага ўзроўню аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў;
- пашырэнню і ўзбагачэнню рэпертуару лепшымі ўзорамі беларускага і сусветнага музычнага мастацтва;
- развіццю выканальніцкай школы ігры на народных інструментах.

**Кіраўніцтва абласным конкурсам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога конкурсу ствараецца абласны аргкамітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", дзяржаўнай установы "Гомельскі абласны цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый у сферы культуры".

У перыяд падрыхтоўкі конкурсу аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення ходу конкурсу, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва конкурсам у тэрмін правядзення мерапрыемства, уводзіць дадатковыя намінацыі.

Заяўкі на ўдзел у абласным конкурсе і творчыя характарыстыкі ўдзельнікаў (разам з відэазапісамі і фотаздымкам у фармаце tiff, або jpeg, або jpg не менш 800х600 пікселяў), скан ці фота квітанцыі аб аплаце ўступнага ўзносу дасылаюцца да 1 кастрычніка 2021 года на электронны адрас: (ocnt7@mail.gomel.by), установа "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці", аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці (форма заяўкі дадаецца).

На афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на працягу 5 дзён пасля апошняга дня прыняцця заявак будзе размешчаны спіс удзельнікаў абласнога конкурсу.

**Падвядзенне вынікаў абласнога конкурсу і ўзнагароджванне.**

Журы будзе ўлічваць:

- выкананне ўмоў конкурсу;
- падбор конкурснай праграмы;
- узровень выканаўчага майстэрства;
- раскрыццё музычна-вобразнага зместу твораў;
- тэхнічныя здольнасці выканання;
- ансамблевы строй;
- культуру гуказдабыцця;
- касцюміраванне.

Па выніках конкурсных выступленняў журы конкурсу вызначае лаўрэата з уручэннем Гран-пры, дыплома і каштоўнага падарунка на суму ў памеры да 9 базавых велічынь; дыпламантаў І, ІІ, ІІІ ступеняў у кожнай намінацыі конкурсу з уручэннем дыплома і каштоўнага падарунка: І ступені – на суму ў памеры да 6 базавых велічынь; ІІ ступені – на суму ў памеры да 5 базавых велічынь; ІІІ ступені – на суму ў памеры да 4 базавых велічынь.

Калектывы, не стаўшыя пераможцамі, але паказаўшыя добры выканаўчы ўзровень, узнагароджваюцца граматамі.

Аргкамітэт абласнога конкурсу прадугледжвае ўзнагароджванне дыпломамі і каштоўнымі падарункамі на суму ў памеры да 2 базавых велічынь ў намінацыях:

- лепшаму салісту-інструменталісту;
- за складанасць рэпертуару.

Пры неабходнасці журы мае права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі або ўвесці новыя. Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае. Ацэначныя балы паводле конкурсных пратаколаў не выносяцца на ўсеагульнае абмеркаванне.

Вынікі абласнога конкурсу размяшчаюцца на сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”. Конкурсныя праграмы пераможцаў будуць даступныя на YouTube канале ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” (https://www.youtube.com/channel/UCM1VyhbWr1NfLumiemWwF5Q) пасля падвядзення вынікаў.

Па выніках абласнога конкурсу выдаецца буклет.

Прагляд конкурсных праграм і падвядзенне вынікаў членамі журы адбудзецца ў лістападзе, узнагароджанне пераможцаў - у снежні.

**Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021-2025 гг. і ўступных ўзносаў.

За кошт сродкаў абласнога бюджэту ажыццяўляецца падрыхтоўка дыпломаў і грамат, аплата працы журы.

Для ўдзелу ў конкурсе калектывам неабходна аплаціць уступны ўзнос. Уступны ўзнос (не ўлічваючы камісіі банкаў) для аркестраў складае 3 базавых велічыні, для ансамбляў 1,5 базавых велічыні.

Рэквізіты для пералічэння ўступнага ўзносу:
Арганізатар/атрымальнік плацяжу: установа “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”. Адрас: г.Гомель, вул.Кірава 49, 246022.
Разліковы рахунак: BY12 AKBB 3632 0401 0009 3300 0000 у Гомельскім філіяле № 300 АСБ “Беларусбанк”
БІК AKBBBY21300
УНН 400002570
ОКПО 55610183000.

Аплата ўступнага ўзносу за ўдзел у конкурсе павінна быць з абавязковым указаннем назвы калектыву і назвы конкурсу.

Уступны ўзнос ўключае ў сябе выдаткі па арганізацыі і правядзенні конкурсу: набыццё каштоўных прызоў і сувенірнай прадукцыі.

У выпадку адмаўлення ўдзельніка ад удзелу ў конкурсе (у тым ліку па ўважлівай прычыне) уступны ўзнос не вяртаецца.

Кантакты для вырашэння арганізацыйных пытанняў:
Паўловіч Карына Андрэеўна +375(29)162-51-88, +375(29)195-03-49.

Дадатак 2
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 2021 г. №

**Умовы**

дыстанцыйнага правядзення IX абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" "Мелодыі роднага краю" імя Г.І. Жыхарава

Абласны конкурс праводзіцца дыстанцыйна ў лістападзе 2021 года з уступным ўзносам.

У абласным конкурсе прымаюць удзел аркестры, ансамблі струнных народных інструментаў толькі з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" клубных устаноў незалежна ад ведамаснай прыналежнасці, дзіцячых музычных школ, школ мастацтваў, устаноў адукацыі.

Калектывы УА "Гомельскі дзяржаўны каледж мастацтваў імя Н.Ф.Сакалоўскага", УА "Мазырскі дзяржаўны музычны каледж" не прымаюць удзел у абласным конкурсе.

**Конкурсныя выступленні праводзяцца па наступных намінацыях:**

- аркестр народных інструментаў з найменнем "народны аматарскі калектыў";
- аркестр народных інструментаў з найменнем "узорны аматарскі калектыў" (дазваляецца да 20% ілюстратараў ад усяго складу);
- ансамбль народных інструментаў з найменнем "народны аматарскі калектыў";
- ансамбль народных інструментаў з найменнем "узорны аматарскі калектыў" (дазваляецца да 20% ілюстратараў ад усяго складу);

**Аркестры, ансамблі прадстаўляюць конкурсную праграму з 2-х рознахарактарных твораў. Час выступлення – не болей 15 хвілін**

**Дазваляецца выконваць:**

- апрацоўку (аранжыроўку, інструментоўку) беларускай народнай песні альбо танца;
- арыгінальны твор для аркестра, ансамбля;

- твор кампазітара-класіка альбо сачыненне сучаснага кампазітара;
- акампанемент салісту-інструменталісту.

Дазваляецца выкарыстоўваць толькі адзін мікрафон для саліста.

Відэазапіс не павіннна ўтрымліваць мантажу і якіх-небудзь спецыяльных эфектаў. Запіс трэба выканаць са штатыва ў высокай якасці без акустычных правалаў. Відэа павінна быць знята адным буйным планам, каб увесь калектыў быў бачны.

Абавязковай умовай для адпраўленых матэрыялаў з'яўляецца выразнасць малюнка і гуку. Гукаўзнаўленне павінна быць якасным, усе нюансы выканання – выразна чутнымі.

Відэазапіс неабходна загрузіць на платформу YouTube у адкрытым доступе. Спасылку на відэазапіс неабходна ўставіць у адпаведную графу ў заяўцы.

Выкарыстанне ў саставе аркестра, ансамбля сінтэзатара дазваляецца толькі пад час адсутнасці аркестравага голасу.

Для ўдзелу ў конкурсе калектывам неабходна аплаціць уступны ўзнос.

Дадатак 3
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад 2021 г. №

**Склад арганізацыйнага камітэта**

IX абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем "народны (узорны) аматарскі калектыў" "Мелодыі роднага краю" імя Г.І.Жыхарава

| | |
|---|---|
| Езерскі Дзяніс Уладзіміравіч | начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта |
| Сафрановіч Наталля Дзмітрыеўна | дырэктар ўстановы "Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці" |
| Чумакоў Дзмітрый Аляксеевіч | начальнік ДУ "Гомельскі абласны цэнтр па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый у сферы культуры" |

# АНКЕТА-ЗАЯЎКА

удзельніка IX абласнога конкурсу аркестраў, ансамбляў струнных народных інструментаў з найменнем “народны (узорны) аматарскі калектыў” “Мелодыі роднага краю” імя Г.І.Жыхарава

________________________(раён, горад)

1. Поўная назва калектыву, ведамасная прыналежнасць
   ________________________________________________
2. Намінацыя (з найменнем “народны (узорны)”________________________________
3. Кіраўнік (поўнае імя, імя па бацьку)
   ________________________________________________
4. Кантактны тэлефон кіраўніка
   ________________________________________________
5. Колькасць удзельнікаў (колькасць ілюстратараў для дзіцячых калектываў)________________________________
6. Творчая характарыстыка калектыву (не больш за 1 старонку) разам з фотаздымкам
7. Скан ці фота квітанцыі аб аплаце ўступнага ўзносу
8. Праграма конкурснага выступу

| Аўтар твора | Назва твора | Хранаметраж | Прозвішча, імя і імя па бацьку саліста (пры наяўнасці) | Спасылка на відэазапіс |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |

Начальнік аддзела (упраўлення)
ідэалагічнай работы, культуры
і па справах моладзі райвыканкамаў,
Гомельскага гарвыканкама

________________ ____________________
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)